# Метадычная майстэрня
# «Перспектыўныя лініі на ўроках беларускай літаратуры»

**В. А. Трафімава,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі СШ № 3 г. Рагачова

**Мэта майстэрні:** плануецца, што да завяршэння мерапрыемства ўдзельнікі будуць мець уяўленне пра выкарыстанне тэхналогіі перспектыўных ліній на вучэбных занятках беларускай літаратуры і ў пазакласнай рабоце.

**Задачы:**

- стварыць умовы для раскрыцця паняцця «тэхналогія перспектыўных ліній»;
- садзейнічаць дэманстрацыі шляхоў і педагагічных умоў для прымянення картак-апор пры выкарыстанні тэхналогіі перспектыўных ліній на вучэбных занятках па беларускай літаратуры.

**Ход педагагічнай майстэрні**

**І. Арганізацыйна-матывацыйны этап**

**Вядучы.** Сёння, на думку метадыстаў, у сучасным адукацыйным працэсе на першы план выступае неабходнасць змянення падыходаў да спосабаў актывізацыі мысліцельнай дзейнасці, фарміравання навыкаў самастойнай працы. У гэтым дапамагаюць новыя адукацыйныя тэхналогіі, вялікая ўвага ў якіх надаецца візуалізацыі, алгарытмізацыі, распрацоўцы і прымяненню апорных схем, сігналаў, табліц, картак, малюнкаў. На аснове гэтага навучальны матэрыял, з аднага боку, раздзяляецца (аналізуецца), з другога – аб’ядноўваецца (сінтэзуецца), чым забяспечваецца цэласнае ўспрыманне матэрыялу, спрацоўвае псіхалагічная ўстаноўка – доўгачасовая памяць, што вельмі важна для трывалага засваення ведаў. Чым актыўней чалавек выкарысоўвае набыты ім у навучанні вопыт, тым хутчэй адбываецца яго развіццё.

Тэхналогія перспектыўных ліній заснавана на такім вывучэнні матэрыялу, калі патрабуецца вылучэнне асобнай тэмы як скразной лініі ў праграме па літаратуры, наяўнасць зрокавага раду, своеасаблівых інфармацыйных апор. Гэтыя апоры даюць магчымасць пастаяннага ўзнаўлення, актуалізацыі, перспектыўнага бачання, сінтэзавання і інтэгравання матэрыялу. Як адзначаецца ў метадычнай літаратуры, гэта тэхналогія можа быць прыдатнай і эфектыўнай пры вывучэнні твораў выдатных майстроў слова, асобных тэм у беларускай літаратуры, пры разглядзе літаратуразнаўчых паняццяў.

**II. Інфармацыйна-дзейнасны этап**

- **Прэзентацыя вопыту вядучага**

**Вядучы.** Рэалізацыя тэхналогіі перспектыўных ліній на вучэбных занятках заключаецца ў запаўненні інфармацыйных картак-апор, якія рыхтуе настаўнік пасля вывучэння новага матэрыялу. А зараз на практыцы: беларуская літаратура 6–7 клас. Адной з важных тэм, якая прапануецца для аналізу падчас вывучэння літаратурных твораў, з'яўляецца тэма Радзімы (яна будзе скразной). Два літаратурныя творы: А. Ставер «Жураўлі на Палессе ляцяць» і перспектыўныя лініі цягнуцца да верша М. Шабовіча «Хоць не бачыў чужых я краін».

Пасля аналізу верша А. Ставера «Жураўлі на Палессе ляцяць» настаўнік прапануе вучням інфармацыйную картку-апору.

| 6 клас<br>А. Ставер «Жураўлі на Палессе ляцяць» | |
|---|---|
| 1. Тэма твора | |
| 2. Вобразы Радзімы | |
| 3.Лірычны герой | |
| 4. Аўтарская пазіцыя (ідэя) | |
| 5. Сродкі мастацкай выразнасці | |
| 6. Атрыманы вопыт | |

Настаўнік ставіць перад класам задачу: запоўніць правую частку карткі-апоры і запісаць разгорнуты адказ на пазначаныя ў картцы пункты. Вучням трэба сфармуляваць канкрэтны адказ на пазначаны пункт. Запісу ў картцы можа папярэднічаць сумеснае абмеркаванне варыянтаў адказаў. Магчымыя варыянты можна фіксаваць на дошцы, затым выбраць самы дакладны ці падрыхтаваць адказ на падставе агульных фармулёвак.

***Прыкладны варыянт запаўнення карткі-апоры***

| **6 клас**<br>**А. Ставер «Жураўлі на Палессе ляцяць»** | |
|---|---|
| 1. Тэма твора | Верш прысвечаны тэме Радзімы |
| 2.Вобразы Радзімы | Беларусь у вершы – гэта азёрны край, далі з соснамі і рабінамі, з мурожнымі пожнямі, гэта зямля, дзе кожная сцяжынка прывядзе ў гасцінны двор |
| 3.Лірычны герой | Лірычным героем верша з'яўляецца адданы сын роднай зямлі, патрыёт |
| 4.Аўтарская пазіцыя (ідэя) | Разлука ўзмацняе пачуццё любові да Радзімы |
| 5.Сродкі мастацкай выразнасці | У вершы аўтар выкарыстоўвае тропы: эпітэты (мілая Беларусь, сасновыя далі, рабінавы край, прыветлівы двор), метафары (далі клічуць, |

| | |
|---|---|
| | сцяжыначка прывядзе). Сродкі мастацкай выразнасці дапамагаюць стварыць яркую карціну і перадаць пачуцці лірычнага героя |
| 6.Атрыманы вопыт | На чужыне чалавек перажывае пачуццё настальгіі |

Пасля запаўнення карткі-апоры настаўнік падводзіць вынікі працы, ацэньвае веды вучняў і іх удзел у рабоце.

Запоўненыя карткі збіраюцца і захоўваюцца настаўнікам для далейшага выкарыстання.

Беларуская літаратура 7 клас. М. Шабовіч «Хоць не бачыў чужых я краін». Задача вучняў – запоўніць картку-апору (пасля знаёмства з вершам і аналізу). Пры фармулёўцы адказаў варта выкарыстоўваць картку-апору (верш А. Ставера «Жураўлі на Палессе ляцяць», што дапаможа высветліць падобныя і адрозныя моманты ў раскрыцці тэмы).

❑ **Калектыўнае ўзаемадзеянне**

**Вядучы.** Паважаныя калегі, прапаную вам запоўніць гэту картку. Можна працаваць самастойна або ў парах.

***Варыянт запаўнення***

| **7 клас**<br>**М. Шабовіч «Хоць не бачыў чужых я краін»** | |
|---|---|
| 1.Тэма твора | Верш прысвечаны малой радзіме |
| 2.Вобразы Радзімы | Малая радзіма ў вершы паўстае ў наступных вобразах: нарачанскія рабіны, жураўлі ў блакіце, на ліпе буслянка, родная вуліца, бацькоўская хата, край рабін, край азёр, край буслоў |
| 3.Лірычны герой | Сын роднай зямлі, які здольны бачыць прыгажосць у жыцці, цаніць сяброўства, любоў |
| 4.Аўтарская пазіцыя (ідэя) | «Я і ў будні, і ў святы з табою»… Любоў да малой радзімы праяўляецца ў вернасці ёй |
| 5.Сродкі мастацкай выразнасці | У вершы аўтар выкарыстоўвае тропы: эпітэты (край азёр, край рабін, край буслоў, блакіт вясны), метафары (вулка звала), параўнанне (стракаты, як сон, матылёк) |
| 6.Атрыманы вопыт | Любоў да Беларусі пачынаецца з любові да малой радзімы |

Каментарый:

❑ **Мадэліраванне**

**Заданне.** Дапішыце у табліцу назвы літаратурных твораў, пры вывучэнні якіх на вучэбных занятках па беларускай літаратуры можна выкарыстоўваць тэхналогію перспектыўных ліній.

***Варыянт запаўнення***

| Тэма мастака і мастацтва |
|---|

| | |
|---|---|
| Янка Купала «Курган» | *Максім Танк «Люцыян Таполя»* |
| Тэма Вялікай Айчыннай вайны | |
| В. Быкаў «Жураўліны крык» | *В. Быкаў «Сотнікаў»* |
| Тэма сяброўства | |
| А. Васілевіч «Сябры» | *М. Лупсякоў «Мэры Кэт»* |

**ІІІ. Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія**

Арганізоўваецца дыскусія па выніках сумеснай дзейнасці.

**Вядучы.** Сёння нельга не пагадзіцца з тым, што матывацыя вучняў на паўтарэнне, замацаванне, сістэмацызацыю ведаў застаецца дастаткова складанай задачай. Тэхналогія перспектыўных ліній (з выкарыстаннем апорных картак і каменціраваннем) садзейнічае актывізацыі навучання, больш якаснаму засваенню ведаў і ўменняў, спрыяе росту ўнутранай матывацыі ўдзельнікаў вучэбнага працэсу. Яна дае магмымасць зрабіць больш разнастайнымі формы навучання, стымулюе пошукавы характар мыслення, садзейнічае самарэалізацыі асобы.